стоящий из двух польских и двух украинских рот.[15] Таким образом, польско-украинское сотрудничество уверенно набирает обороты, о чем свидетельствует обращение А. Квасьневского к МВФ, ЕБРР и Всемирному банку с просьбой поддержать украинские экономические реформы.

Совсем иначе складываются отношения Польши с Беларусью. Польское правительство настораживает российско-белорусское сближение, а также его негативное отношение к ходу проводимых здесь реформ. Если в начале 1990-х гг. Беларусь провозгласила курс на сближение и сотрудничество с Польшей и странами Запада, то с середины 90-х гг. ее внешнеполитические установки изменились, тем не менее новый курс не помешал развитию экономического сотрудничества двух стран.

Можно утверждать, что Польша свой выбор сделала еще в конце 80-х гг., а к концу 90-х достигла немалого в осуществлении поставленных целей. Польское правительство активно участвует в общеевропейских начинаниях в деле поддержания стабильности и порядка в Европе. Являясь участницей объединений как регионального, так и мирового уровней, Польша все чаще заявляет о себе как о значимом члене мирового сообщества.

[1] См.: Безопасность будущей Европы. М.: Наука, 1993. С. 53.

[2] См.: Vachudova M.A. Tim Snyder. Are Transitions Transitory? Two Types of Poiitical Change in Eastern Europe Since 1989 // East-European Politics & Societies. Winter, 1997. Vol. 22. No. 1. P. 31.

[3] См.: Dobroczyński M. Pomiędzy Rosią a Zachodem. Międzynarodowa pozycja Polski. Torun, 1992. S. 117.

[4] См.: Bielecki J. Kto głosuje za Polska? // Rzeczpospolita. 1998. 8 lipca. S. 7.

[5] См.: Польша готова помочь России вступить в НАТО. Президент Республики Польша Александр Квасьневский отвечает на вопросы «Известий» // Известия. 1999. 12 марта. С.4.

[6] Там же. С. 4.

[7] См.: Teresa Łos-Nowak. NATO: Prospektywny model bezpieczenstwa zewnetrznego Polski // Studia historyczne i politologiczne Pod redakcją R. Gellesa i Wolanskiego M.S. Wrocław, 1997. S. 479.

[8] См.: Sokołowski A. Niemcy w polityce Aleksandra Kwasniewskiego // Studia historyczne i politologiczne. Pod redakcją R. Gellesa i M.S. Wolańskiego. Wrocław, 1997. S. 435.

[9] См.: Юсин М. «МиГи» и «Су» еще летают в польском небе. В Варшаве мечтают об их замене, но денег на это нет // Известия. 1999. 27 января. С. 3.

[10] См.: Polska w NATO za 3 miesiące // Rzeczpospolita. 1998. 17 lipca. S. 5.

[11] См.: Михник А. («Газета выборча»). Не играть с Россией // Известия. 1995. 5 мая. С. 3.

[12] См.: Kosciuk L. Prognoza reakcji Rosji na rozszerrzenie NATO. Warszawa, 1996. S. 5.

[13] См.: Miall H. Shaping a New European Order. The Royal Institute of International Affairs. New York, 1994. P. 92.

[14] См.: Виноградов Б. Германия и Польша берут курс на «Норд-ост» // Известия. 1998. 9 декабря. С. 3.

[15] См.: Юсин М. Указ. пр.

*А.Г. ЗЕЛЬСКІ*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ БІТВЫ НА РАЦЭ АМНЯЁН У КРЫНІЦАХ І ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Бітва на рацэ Амняён, што адбылася вясной 88 г. да н. э., была першым буйным боем I Пантыйскай (Мітрыдатавай) вайны – 89–85 гг. да н. э. Менавіта пасля яе тэатр ваенных дзеянняў значна пашырыўся і ахапіў усю Малую Азію, Балканскі паўвостраў, Чорнае і Эгейскае моры. Вайна, якая пачалася як невялікі канфлікт, амаль адразу набыла вялізарныя памеры. І гэта таксама было адным з вынікаў сутыкнення на рацэ Амняён. Але сама бітва неяк прайшла міма ўвагі гісторыкаў і спецыялістаў па ваеннаму мастацтву. Хаця па сваіх асаблівасцях і выніках яна можа стаць у адзін шэраг з вядомымі бітвамі старажытнасці.

Да пачатку I ст. да н. э., як сведчаць Страбон (XII, 3, 1) і Апіян (Mithr., 15), уладанні пантыйскага цара Мітрыдата VI Еўпатара выраслі з параўнальна невялікага царства да вялікай дзяржавы і ахапілі значную частку Малой Азіі і амаль усё ўзбярэжжа Понта Эўксінскага.

Заваёўніцкая палітыка Мітрыдата VI і яго актыўная дыпламатычная дзейнасць выклікалі ўсёўзрастаючую занепакоенасць Рыма. Апіян паве-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

дамляе (Mithr., 10), што рымляне самі з зайздрасцю глядзелі на краіну, падуладную Мітрыдату, і жадалі падзяліць яе на некалькі частак.

У 99 г. да н. э. у Малую Азію накіраваўся рымскі палкаводзец Гай Марый. Мэтай яго падарожжа, на думку нямецкага гісторыка Т. Момзена, было імкненне падтрымаць палітычны аўтарытэт, які пахіснуўся на радзіме[1] і, як піша Плутарх (Mar., XXXI), «узбудзіць цароў і падбухторыць Мітрыдата да вайны». Гай Марый лічыў, што ў выпадку вайны ён стане палкаводцам і зможа гэткім чынам паправіць свае палітычныя і грашовыя справы. Прыязна прыняты Мітрыдатам, Гай Марый параіў цару маўчаць і рабіць, што яму загадваюць, або збіраць сілы. Гэты візіт яшчэ больш умацаваў недавер і варожасць Мітрыдата да Рыма.

У сярэдзіне 90-х гг. да н. э. усё Кападакійскае царства апынулася пад уладай Мітрыдата. Т. Момзен адзначае, што Нікамед III, цар Віфініі, які таксама імкнуўся захапіць Кападокію, звярнуўся па дапамогу да Рыма[2].

Рэакцыя рымскага сената выявілася ў прызнанні царом Кападокіі прарымскі настроенага Арыёбарзана Філарамея[3]. Аднак Мітрыдат не збіраўся саступаць рымлянам Кападокію. Ён схіліў армянскага цара Тыграна II да сяброўства і саюзу і прапанаваў яму, як больш вольнаму ў сваім становішчы ў адносінах да рымлян, накіраваць войскі ў Кападокію, што падкрэслілі Т. Момзен і англійскі даследчык Е. Уіл[4]. Армянскія войскі хутка авалодалі Кападокіяй, аднавіўшы ўладу стаўленіка Мітрыдата.Тады рымскі сенат загадаў прапрэтару правінцыі Кілікія Луцыю Карнэлію Суле аднавіць на прастоле Арыёбарзана. Войскі Сулы і азіяцкіх саюзнікаў, як піша Плутарх (Sulla., V), выцеснілі з Кападокіі намесніка Мітрыдата Гордыя разам з армянскімі атрадамі, перабіўшы шмат кападакійцаў.

У 92 г. да н. э. Сула пакінуў правінцыю Азія. У хуткім часе пасля гэтага памёр састарэлы цар Віфініі Нікамед III (ля 91 г. да н. э.). Рымскі сенат прызнаў царом яго сына Нікамеда IV Філапатара. Аднак яго малодшы брат Сакрат, абапіраючыся на пантыйскія войскі, перахапіў уладу над Віфініяй. Як адзначае Апіян (Mithr., 10), пасля гэтага Сакрат і военачальнік цара Тыграна II Мітраас выкінулі з Кападокіі стаўленіка рымлян Арыёбарзана і пасадзілі на трон у ей Арыярата. Гэты час быў адзначаны найбольшымі дыпламатычнымі поспехамі Мітрыдата ў Малой Азіі. Цяпер улада пантыйскага цара распаўсюджвалася, акрамя ўласна Понта, Пафлагоніі і Галатыі, яшчэ фактычна на Віфінію і Кападокію. Такім чынам, Мітрыдат валодаў ужо амаль усёй Малой Азіяй. І хаця знешне ён выглядаў толькі як сведка усіх падзей, рымляне адчувалі, што менавіта ён з'яўляецца той галоўнай фігурай, якая рушыць ўсе падзеі на Усходзе. Так ацаніў ролю цара савецкі гісторык С.Л. Утчанка[5].

Нікамед І Арыёбарзан звярнуліся па дапамогу да Рыма. Але рымлянам у той час было не да падзей у Малой Азіі. У Італіі ўжо ішла Саюзніцкая вайна (91–88 гг. да н. э.), прычым падзеі разгортваліся не на карысць рымлян. І усё ж сенат, каб зусім не страціць кантроль над царствамі ў Малой Азіі, скіраваў туды пасольства, на чале якога стаяў Маній Аквілій.

Апіян (Mithr., 11) кажа, што аказаць неабходную дапамогу для вяртання на прастол цароў Нікамеда і Арыёбарзана было даручана таксама Луцыю Касію, намесніку ў Азіі, і цару Мітрыдату. Ад адкрытага супраціўлення Мітрыдат устрымаўся, але і ухіліўся ад адпраўкі патрабуемых войскаў. Тады Маній Аквілій і Луцый Касій пры дапамозе рымскіх войскаў і атрадаў, набраных сярод галатаў і фрыгійцаў, вярнулі Нікамеда ў Віфінію, а Арыёбарзана – у Кападокію.

Чаму ж Мітрыдат не аб'явіў вайны ў той час, калі Саюзніцкая вайна была ў самым разгары?[6] Т. Момзен тлумачыць гэты факт адсутнасцю ў пантыйскага цара палітычнага разліку і дзяржаўнай мудрасці[7]. Але на справе яго царства не было падрыхтавана як след да вайны. Усю І Пантыйскую вайну, як пішуць Апіян (Mithr., 49) і Плутарх (Sulla., XI), Мітрыдат правёў удалечыні ад тэатра ваенных дзеянняў, у Пергаме, збіраючы сродкі і армію



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

для вайны. Цар умацоўваў дзяржаву, добра разумеючы, што калі толькі ў Рыма развяжуцца рукі, то ён (Рым) з усёй магутнасцю абрушыцца на яго.

Рымскія паслы ў Азіі настойвалі на адкрыцці Нікамедам IV у Віфініі і Арыёбарзанам у Кападокіі ваенных дзеянняў супраць Мітрыдата. Але цары вагаліся, баючыся распачынаць вайну. Тады Маній Аквілій прымусіў Нікамеда, які быў вінен вялізарныя сумы грошай за дапамогу асабіста паслам, военачальнікам, рымскім ліхвярам. Так Апіян дакладна вызначыў віну рымскага пасольства ў развязванні канфлікту (Mithr., 11). Віфінія аб'явіла вайну. Але і тады, калі караблі Нікамеда занялі пралівы і перарэзалі марскія шляхі, а яго войскі спусташалі пантыйскія землі да г. Амастрыі (App., Mithr., 11–12, 14; Sall., Histor., VI, 10), Мітрыдат прытрымліваўся сваей палітыкі міру. Замест таго, каб выбіць віфінцаў за межы сваіх уладанняў, Мітрыдат праз пасла Пелапіда звярнуўся са скаргай да рымскіх паслоў. Пелапід, прыгадаўшы ранейшыя крыўды, што нанеслі рымляне і іх саюзнікі Мітрыдату, прасіў, каб рымляне ці ўступіліся за цара Мітрыдата, ці дазволілі яму абараняцца ўласнымі сіламі (App., Mithr.,12, 14). Адказ рымлян быў ужо вырашаны. Яны заявілі, што не хочуць, каб Мітрыдат меў непрыемнасці ад Нікамеда, і не пацерпяць, каб супраць Нікамеда была ўжыта сіла. Такая крывадушніцкая палітыка рымскага пасольства вывела б любога з сябе, не тое што такую кіпучую асобу, як Мітрыдат. Свайму сыну Арыярату цар аддаў загад увайсці ў Кападокію. Адначасова ён ізноў накіраваў да рымлян Пелапіда з заявай, што цар дзейнічае ў мэтах абароны. Апіян падкрэслівае моц і палітычную волю Мітрыдата (Mithr., 15–16), Пелапід, прыгадаўшы, у сувязі з гэтым запатрабаваў канчатковых тлумачэнняў. Аднак пагрозы Пелапіда зусім не напалохалі рымлян. Як падкрэслівае сучасная англійская гістарыяграфія, вайна была неад'емнай часткай жыцця рымлян і да таго ж вельмі прыбытковай справай[8]. Адказ быў такі, які можна было чакаць. Рымляне загадалі Мітрыдату пры ўсіх абставінах устрымацца ад вайны з Нікамедам. Перамовы зайшлі ў тупік. Як слушна адзначыў Т. Момзен, «хаця ні рымскі сенат, ні цар Мітрыдат, ні цар Нікамед не жадалі канчатковага разрыву, Маній Аквілій жадаў яго, і вайна пачалася»[9] (восень 89 г. да н. э.).

Маній Аквілій давёў справу да разрыву з Мітрыдатам, не чакаючы рашэння сената, таму што момант быў зусім нязручны. Пры тых ваенных і фінансавых цяжкасцях, якія адчуваў Рым у сувязі з Саюзніцкай вайной, рымская армія магла высадзіцца ў Азіі не раней лета 88 г. да н. э.

Пасля таго як скончыліся перамовы, Маній Аквілій і Луцый Касій пачалі сцягваць войскі да межаў Понта і Кападокіі. Адначасова працягваўся хуткі збор войскаў у Віфініі, Пафлагоніі і Галатыі.

На аснове сведчанняў антычных аўтараў мы можам зрабіць выснову, што стратэгічная задума рымлян была простая: распалажыўшыся трыма асобнымі групоўкамі, нанесці ўдары па Кападокіі і Понту, прымусіць Мітрыдата да капітуляцыі. У адваротным выпадку можна было б утрымліваць стратэгічныя пазіцыі, каб не дапусціць пантыйскія войскі ў правінцыю Азія і, дачакаўшыся прыбыцця легіёнаў з Італіі, разбіць непрыяцеля.

Апіян (Mithr., 17) пакінуў нам дакладныя звесткі, што Луцый Касій стаў лагерам у сярэдзіне Віфініі і Галатыі, Маній Аквілій заняў пазіцыі на мяжы Віфініі з Понтам – там, дзе Мітрыдату быў найбольш лёгкі шлях для уварвання ў Віфінію. Другі военачальнік Опій прыкрываў межы Кападокіі. Кожны з іх меў па 4000 коннікаў і ля 40000 пяхоты. З мора падтрымліваў сухапутныя сілы і ахоўваў уваход у Понт рымскі флот, якім камандавалі Мінуцый Руф і Гай Папілій. Базай флота была марская гавань Візантыя (App., Mithr., 17). Разам з рымлянамі дзейнічала войска віфінскага цара Нікамеда, пад камандаваннем якога было сабрана 50000 пяхоты і 6000 конніцы.

Мітрыдат да вайны змог падрыхтаваць 250000 пяхоты і 40000 конніцы. Каля 10000 коннікаў прывёў з Малой Арменіі яго намеснік, сын цара Аркафій, Кратэр – 130 баявых калясніц. На моры дзейнічаў флот, які налічваў 300 баявых суднаў з крытай палубай і 100 бірэм. Галоўнае кіраўніцтва арміяй ажыццяўляў цар. Ён жа непасрэдна камандаваў большай часткай



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

войска. Асобнымі атрадамі камандавалі военачальнікі Мітрыдата браты Архелай і Неапталем, фаланга была ў падпарадкаванні Дарылая (Арр., Mithr., 17).

На нашу думку, усе вышэйпрыведзеныя лічбы колькасці войскаў яўна перабольшаны Апіянам (асабліва войскаў Мітрыдата), але ў цэлым адпавядаюць верагоднай расстаноўцы сіл.

Т. Мемнон (XXXI, I) прыводзіць значна меншую лічбу колькасці войскаў Мітрыдата – 200000 чалавек і паведамляе, што з іх Архелаю падначальвалася 40000 пяхоты і 10000 конніцы.

Дарэчы, па падліках расійскага вучонага Я. Молева, армія ў 200000 чалавек патрабавала на сваё ўтрыманне ад 22 да 33 талантаў штодня. Толькі на плату 80-тысячнай арміі Дарылая штодня патрабавалася ад 9 да 13 талантаў (лічачы аплату кожнага гапліта ад 4 аболаў да 1 драхмы штодзень). Просты падлік паказвае, што тыя 200 талантаў даніны, якія Мітрыдат атрымліваў з Баспора штогод (Strab., VII, 4, 6), маглі быць выдаткаваны за 20 дзён[10]. Усё гэта сведчыць больш на карысць дадзеных Мемнона.

Антычныя аўтары нічога не паведамляюць аб планах Мітрыдата. Логіка ж развіцця далейшых падзей магла быць наступнай. Напэўна, даведаўшыся аб месцах размяшчэння войскаў непрыяцеля праз сваіх разведчыкаў, Мітрыдат вырашыў нанесці ўдар першым, разбіць праціўнікаў паасобку, вырваўшы з рук ворага стратэгічную ініцыятыву. Можна меркаваць, што нейкую частку сіл цар пакінуў для прыкрыцця межаў ад магчымага ўварвання непрыяцельскіх войскаў. Як паведамляе Т. Мемнон (XXXI, I), асноўная групоўка пантыйскіх войскаў знаходзілася ля горада Амасія, першай сталіцы Понта, чакаючы прыбыцця саюзных атрадаў.

У пачатку вясны 88 г. да н. э. войскі Нікамеда і авангард пантыйцаў на чале з Архелаем сустрэліся на адным з прытокаў памежнай ракі Галіс, Амняёне (пры сучасным Тэш Кепры)[11], у вобласці Даманітыда (Strab., XII, 3, 40). Поле бітвы ўяўляла шырокую раўніну, толькі ў адным месцы знаходзіўся скалісты ўзгорак, непадалёку працякала рака Амняён (Арр., Mithr., 18).

Нікамед камандаваў усё тымі ж 50000 пехацінцаў і 6000 коннікаў (Арр., Mithr., 17). Што тычыцца колькасці авангарда пантыйскай арміі, то тут ёсць пэўныя разыходжанні. Згодна Мемнону (XXXI, I) – 40000 пяхоты і 10000 конніцы. Апіян (Mithr., 18) аб колькасці не гаворыць, паведамляючы толькі, што ўзначальваючыя войска Архелай і Неапталем мелі толькі лёгкаўзброеных воінаў, 10000 коннікаў царэвіча Аркафія і некалькі баявых калясніц. Гэта пацвярджаюць дадзеныя Мемнона аб колькасці конніцы ў войску пантыйцаў. Але Апіян (Mithr., 19) дадае таксама, што армія Нікамеда колькасна значна перавышала пантыйскае войска. Баявое пастраенне хутчэй за ўсё было традыцыйным: на флангах – конніца, у цэнтры – пяхота.

Зыходзячы з апісання бітвы, якое зрабіў Апіян, вылзелім тры этапы.

I этап. Каб не быць акружанымі віфінцамі, якія колькасна пераважалі, з левага фланга, Неапталем накіраваў невялікі атрад на скалісты круты ўзгорак, які замацаваўся на ім. Такім чынам, флангі пантыйскіх войскаў былі прыкрыты з правага фланга ракой, з левага – узгоркам. Хутчэй за ўсё пантыйскія военачальнікі меркавалі пратрымацца да падыходу галоўных сіл, за авангардам ішла фаланга (Арр., Mithr., 18), а затым даць рашаючы бой.

Верагодна, бачачы сваю перавагу, Нікамед вырашыў знішчыць спачатку перадавыя войскі пантыйцаў, а потым альбо працягнуць наступ, альбо замацавацца ў лагеры. Віфінцы перайшлі ў наступ і моцным ударам скінулі з узгорка пантыйскі атрад. Неапталем, баючыся флангавага ўдару і акружэння, імкліва кінуўся сваім на дапамогу. Разам з яго салдатамі віфінцаў атакавала і конніца Аркафія (Арр., Mithr., 18).

Заўважыўшы гэты манеўр пантыйцаў, Нікамед кінуў супраць іх свае асноўныя сілы. Ля ўзгорка адбыўся страшэнны бой з «вялікім кровапраліццем» (Арр., Mithr., 18). Карыстаючыся перавагай у сілах, войска Нікамеда пачало перамагаць.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

II этап. Пантыйцы, не вытрымаўшы націску, пачалі адыходзіць і нават месцамі бегчы з поля бою. Віфінцы праследавалі адступаючага праціўніка, пры гэтым неасцярожна адкрылі свой левы фланг, што і выкарыстаў Архелай. Ён ударыў па флангу войска Нікамеда і прымусіў яго развярнуцца супраць сваіх атрадаў. Прыняўшы бой, Архелай пачаў паступова адыходзіць і, стрымліваючы націск ворага, даў магчымасць Неапталему і Аркафію спыніць адыходзячых воінаў.

III этап. Калі Архелай заўважыў, што правы фланг пантыйцаў спыніўся і перастроіўся, ён перайшоў у наступленне з выкарыстаннем баявых калясніц, удар якіх быў страшэнны, іх косы пачалі рассякаць віфінскіх салдат на часткі, ствараючы жахлівае відовішча. Віфінцаў ахапіла паніка, і яны змяшалі свае рады. Архелай імкліва атакаваў з перадавой лініі фронту, а з левага фланга і тылу – атрады Неапталема і конніца Аркафія, якія хутка перастроіліся. Лёс віфінскай арміі быў вырашаны: змяшаўшыся, войска яшчэ некаторы час абаранялася, але большая частка акружаных была знішчана, а Нікамед з невялікім атрадам уцёк з поля бою, і салдаты пачалі здавацца ў палон. Падышоўшай да поля бітвы фаланзе Мітрыдата, як паведамляе Апіян (Mithr., 18), так і не давялося уступіць у бой .

У якасці трафеяў пераможцам дастаўся ўвесь лагер Нікамеда з вялікай колькасцю грошай і аграмаднай колькасцю палонных, якіх Мітрыдат пашкадаваў і, даўшы грошай на дарогу, адпусціў дамоў, стварыўшы сабе сярод ворагаў славу літасцівага і міласэрднага (App., Mithr., 18).

Бітва на рацэ Амняён мае свае асаблівасці. Па-першае, сустрэчны характар бітвы – пантыйскае войска прама з маршу пайшло ў бой. Віфінцы ж мелі лагер і магчымасць падрыхтавацца да бою. Па-другое, падчас бою віфінцы былі прымушаны манеўрамі пантыйскіх войскаў увесь час перастройвацца то супраць Неапталема, то супраць Архелая, губляючы час і несучы вялікія страты. Па-трэцяе, асноўныя сілы арміі Мітрыдата не прынялі ўдзел у бітве, дзе змагаліся толькі авангардныя часці пантыйцаў. Па-чацвёртае, перамогу «атрымала войска нешматлікае над пераўзыходзячым яго колькасцю праціўнікам, дзякуючы военачальнікам і мужнасці войска» (App., Mithr., 19). Асаблівасцю падзеі з'яўляецца і вызваленне Мітрыдатам ваеннапалонных, зразумела, з далёкім палітычным разлікам. Дарэчы, Мітрыдат і пазней практыкаваў дараванне ваеннапалонным свабоды (App., Mithr., 19) на тэрыторыі Малой Азіі.

Перамога ў бітве на рацэ Амняён мела значныя вынікі. Рымляне і іх саюзнікі апынуліся раз'яднанымі. Паражэнне моцна падзейнічала на баявы дух усіх рымскіх войскаў, асабліва набраных з мясцовага насельніцтва. Выхапіўшы з рук рымлян стратэгічную ініцыятыву, Мітрыдат сам навязваў праціўніку бой, не даючы яго войскам аб'яднацца. Пасля бітвы пантыйскія войскі, па сведчанні Страбона (XIII, 3, 40), з ходу захапілі Віфінію і авалодалі Малой Азіяй аж да Карыі і Лікіі. «Імклівы націск», «уварванне», «нечаканы віхор Пантыйскай вайны» – так называюць рымскія гісторыкі баявыя дзеянні пантыйцаў у Малой Азіі (Eutrop., V, 3; App., Mithr., 20; Flor, I, 40, 5).

Як паведамляе Апіян (Mithr., 19–21), Мітрыдат разбіў ушчэнт раз'яднаныя рымскія войскі і хутка авалодаў правінцыяй Азія і пачаў рыхтавацца да пераносу баявых дзеянняў на Балканскі паўвостраў. Вайна працягвалася.

Пасля бітвы на рацэ Амняён стратэгічная ініцыятыва на некаторы час перайшла на бок пантыйскай арміі. Вайна, развязаная ў Малой Азіі па ініцыятыве рымскага камандавання, павярнулася не на карысць рымлян. Бітва на рацэ Амняён уяўляе сабой узор тактычнага майстэрства, умелага выкарыстання рэльефу мясцовасці, узаемадзеяння войскаў, умелага кіраўніцтва боем.

[1] Гл.: Моммзен Т. История Рима. М., 1937. Т. 2. С. 198.
[2] Гл.: Там жа. С. 262.
[3] Гл.: Бикерман Г. Хронология древнего мира. М., 1976. С. 200.
[4] Гл.: Моммзен Т. Указ. твор. Т.2. С. 262; Will E. Histoire politique du Monde hellenistique. Nancy, 1967. T. 2. P. 397.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[5] Гл.: Утченко С.Л. Древний Рим. События, люди, идеи. М., 1969. С. 32.
[6] Гл.: Нечай Ф.М. Рим и италики. Мн., 1963. С. 145.
[7] Гл.: Моммзен Т. Указ. твор. Т. 2. С. 264.
[8] Badian E. Roman imperialism in the late Republic. Ed.2. Oxford, 1968. P. 17, 18, 20; Harris W.V. War and imperialism in Republic Rome. 327–70. D.C. Oxford, 1979. 9f, 54f.
[9] Моммзен Т. Указ. твор. Т. 2. С. 266.
[10] Гл.: Молев Е.А. Митридат Евпатор. Создание черноморской державы. Саратов, 1976. С. 62.
[11] Гл.: Моммзен Т. Указ. твор. Т. 2. С. 267.

*О.В. ПЕРЗАШКЕВИЧ*

## К ВОПРОСУ О *ДАСЬЮ* КАК СОЦИАЛЬНОЙ СТРУКТУРЕ РИГВЕДИЙСКОГО ОБЩЕСТВА

Проблемы социальной организации общества, нашедшие отражение в древнейшем арийском письменном памятнике – Ригведе – привлекают внимание исследователей уже более века. Одним из существенных вопросов здесь является понимание тех социальных структур, которые именуются в текстах памятника варнами, т. е. ариев и тех, которые упоминаются как «даса» или «дасью». В настоящей работе речь пойдет именно о *дасью*.

В известных автору исследованиях основные позиции по этому вопросу о *дасью* выглядят, следующим образом.

1. *Дасью* – это название, данное ариями коренному населению Индии. Причем в основе такого понимания лежит либо только «визуальный» фактор – цвет кожи (раса), который у ариев светлый, а у дравидов темный[1], либо целая группа этнических признаков: религиозная принадлежность, различие в языке и расе (например, форме носа или рта)[2].

2. *Дасью* – это ригведийское название древних иранцев, что основывается либо на данных лингвистики[3], либо мифологии[4].

Представляется целесообразным предложить свое видение проблем понимания *дасью* в ригведийском обществе, основанное на результатах текстового анализа. Позволим себе только два предварительных замечания.

Во-первых, вопрос расового единства доарийского населения Индии, который имеется в виду сторонниками разделения ригведийского общества на ариев и *дасов* (*дасью*) по какому-либо из внешних признаков дравидийской расы. Согласно результатам исследований этнической ситуации на южноазиатском субконтиненте, и в том числе на территории Пенджаба в бассейне Инда и его притоков, во второй половине II тыс. до н. э. (т. е. в том регионе, где создавалась Ригведа) приходившие сюда индоевропейцы-арии вступали в контакт не только с темнокожими веддоидами (относящимися к австралоидной расе) и дравидами (представителями южноиндийской европеоидно-австролоидной переходной группы), но и с австроазиатами (представителями южноазиатской монголоидно-австролоидной переходной группы), появившимися здесь не позднее IV тыс. до н. э., по всей видимости, из Китая, чье внешнее сходство с веддоидами и дравидами в это время являлось, вероятно, далеко не столь очевидным, чтобы их можно было зачислить в одну варну по этому признаку[5]. Следовательно, поскольку речь идет как минимум о трех расах, практически маловероятно, чтобы внешние расовые признаки являлись для создателей Ригведы основанием для классификации своего социального космоса по принципу бинарной оппозиции.

Во-вторых, весьма серьезным аргументом против того, что *дасью* использовались создателями Ригведы как название коренного населения в целом, является наличие в этом памятнике для обозначения тех, кто противостоит ариям (или их части, что еще более затрудняет доказательство понимания ариями доарийского населения как единого целого), термина «*пани*», являвшегося скорее всего этнонимом дравидийского происхождения, что убедительно доказал Н.В. Гуров[6].



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm